# Выстаўка, прысвечаная Янку Купалу

У Мінску, у Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна адкрылася выстаўка літаратуры і фотаілюстрацый, прысвечаная 80-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. На першым стэндзе — словы паэта:

Я адплаціў народу,
Чым моц мая магла:
Зваў з путаў на свабоду,
Зваў з цемры да святла.

Экспануюцца многія творы Купалы, якія выйшлі з друку ў дарэвалюцыйны перыяд творчасці і ў гады Савецкай улады. Сярод іх — пецярбургскія выданні кніг «Паўлінка», «Адвечная песня», «Сон на кургане» і іншых.

Шырока прадстаўлены кнігі паэта, выдадзеныя ў паслякастрычніцкія гады. Тут — зборы твораў, зборнікі вершаў, драматычныя творы. Экспануюцца таксама вершы Янкі Купалы на ўкраінскай, узбекскай, латышскай і іншых мовах народаў СССР.

Вялікі раздзел выстаўкі прысвечан жыццю і творчасці народнага паэта.

Янку Купалу прысвечаны вершы многіх паэтаў. На выстаўцы экспануюцца творы народных паэтаў Якуба Коласа і Петруся Броўкі, паэтаў Максіма Танка, Максіма Лужаніна, Анатоля Астрэйкі і іншых беларускіх літаратараў.

(БЕЛТА).

---

# Бівень мамонта

ЛЬВОЎ, 12. (ТАСС). Калі з каўша шагаючага экскаватара была высыпана захопленая парода, побач з кавалкамі сернай руды ляжаў... бівень мамонта. Неўзабаве ўдалося адшукаць другі бівень, затым многія косці шкілета. Усё гэта знаходзілася на глыбіні каля дваццаці метраў у кар'еры Раздольным горнахімічнага камбіната.

Знойдзеныя ў рудніку камбіната астанкі мамонта пацвярджаюць, што прыкладна 15—20 тысяч гадоў назад у заходніх аб